

## ЛідзіАна

Лідзія Пятроўна Возісава (псеўданім — ЛідзіАна) нарадзілася ў в. Лебядзёўка (да 1994 в. Зэфельд) Добрушскага раёна Гомельскай вобласці 18 красавіка 1949 года. Атрымала спецыяльнасці біёлага-хіміка і псіхолага ў дзяржуніверсітэтах г. Іжэўска і імя Ф. Скарыны г. Гомеля. Доўгі час жыла ў Удмурціі. Працавала адказным сакратаром газеты «Прикамская правда». Акрамя адзначанага псеўданіма ЛідзіАна, друкавалася пад імёнамі Вера Бархатава, Л. Плешкунова, Л. Кралевіч. Пасля вяртання на радзіму працавала ў Гомельскай райарганізацыі «Кніга». Народная лекарка. Маці 3-х дзяцей.

Паэт, празаік. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар паэтычных зборнікаў «Прызнанне», «Касание Перста», «Следы» (прытчы ў вершах), «Выток пачуццяў», «Эхо небес», «Хованкі» і інш. Шэраг апавяданняў і эсэ выйшлі ў перыядычным друку. Вершы друкаваліся ў калектыўных зборніках «Святло шчымлівай памяці» (Гомель, 2006), «Натхненне. Вдохновение» (Мазыр, 2007), «Пралеска» (Гомель, 2010), «Первоцвет» (Брянск, 1989), «Літаратурная Гомельшчына» (Мазыр, 2008, 2009, 2010), «Десна» (Брянск, 2006), «Славянские колокола», «И целый мир в душе моей» (Брянск, 1996 г.) Лаўрэат Першага літаратурнага конкурсу імя Кірылы Тураўскага (2007). Адзначана архіерэйскай граматай Турава-Мазырскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Жыве ў Гомелі.

У СПБ з 2006 года.